# Народная Асвета

11/1995

тычным падыходам у навучанні і выхаванні, а для вучняў — авалоданне культурай разумовай працы, навыкамі здаровага спосабу жыцця і матывацыі вучобы.

На этапе дыферэнцыяцыі навучання вядучая задача кіравання — фарміраванне даследчага мыслення і авалодванне асновамі педагагічных тэхналогій самага разнастайнага віду: кіраўніцтва прафесіянальным самавызначэннем, далучэнне навучэнцаў да разнастайных відаў дзейнасці, арганізацыя развіцця калектыву, самапазнання, самакантролю, самавыхавання і ўзаемавыхавання выхаванцаў, стварэнне індывідуальнага спосабу жыцця вучня. На этапе індывідуалізацыі навучання — фарміраванне творчага педагагічнага мыслення ў працэсе стварэння настаўнікамі і выхавацелямі аўтарскай канцэпцыі, тэхналогіі, дыдактычных комплексаў, уключэнне вучняў у творчую пазнавальную даследчую дзейнасць ва ўрочны і пазаўрочны час, пераход педагагічнай карэкцыі адоранасці ў самавыхаванне таленту, здольнасцей кожнага вучня.

Эксперыментальная работа дазволіла зрабіць наступныя вывады:

1. Канцэптуальнасць адукацыйнага працэсу ў гімназіі грунтуецца на пяці асноўных кампанентах:

а) мэтамеркаванне, арыентаванае на выхаванне адоранай творчай асобы;

б) вызначэнне новага зместу адукацыі, што ўключае базавае, але не арыентаванае на агульнае культуралагічнае развіццё вучняў;

в) прадастаўленне ў рамках статута гімназіі свабоды метадычнай творчасці настаўнікам, выхавацелям і свабоды выбару вучням профілю навучання, паглыбленага вывучэння матэрыялу, магчымых заняткаў самаадукацыі ў любой галіне;

г) арыентацыя ў любым асяроддзі адукацыі на прыярытэт здароўя і гігіены вучняў;

д) безупыннае дыягнастычнае забеспячэнне ўсіх звёнаў на ўсіх этапах адукацыйнага працэсу.

2. Крытэрыямі эфектыўнасці навучальнага працэсу ў гімназіі з'яўляюцца паказчыкі росту педагагічнай культуры настаўніцтва, а таксама тэмпы, дыяпазон і глыбіня духоўнага і фізічнага развіцця вучняў.

3. Добразычлівая аптымістычная атмасфера ў гімназіі з'яўляецца вынікам арыентацыі педагагічнага калектыву на безупынны творчы пошук па ўдасканаленню навучання, выхавання і забеспячэння кожнаму вучню магчымасці дасягаць поспеху не толькі ў вучобе, але і ў фізічным і духоўным развіцці, пазнаваць радасць зносін з прыродай, цікавымі людзьмі і г. д. Аптымістычная атмасфера ў гімназіі з'яўляецца рэальнай базай для педагогікі садружнасці і супрацоўніцтва, садзейнічае пераходу выхавання ў самавыхаванне.



# ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫЯ ІДЭІ ПРОДКАЎ— У СУЧАСНАЕ ВЫХАВАННЕ

***В. С. БОЛБАС,***
***дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Мазырскага педінстытута, кандыдат педагагічных навук***

Так ужо склалася, што на розных этапах развіцця савецкай школы з мноства педагагічных ідэй вылучаліся асобныя, якім надаваўся статус вядучых. Пры гэтым лічылася, што з іх дапамогай будзе нарэшце радыкальна зменена эфектыўнасць існуючай навучальна-выхаваўчай сістэмы. У апошнія дзесяцігоддзі ў якасці такіх выступалі ліпецкі метад, комплексны падыход да выхавання, праблемнае навучанне, пазней — дыферэнцыяцыя навучальна-выхаваўчай работы, а сёння — апора на народную педагогіку.

Шкада, што празмерны перакос у бок таго ці іншага падыходаў, аднабаковае яго выкарыстанне не толькі не забяспечвалі плануемых вынікаў, але і пацвярджалі невысокую эфектыўнасць абранага шляху. Пасля гэтага часта наогул адракаліся ад прыўносімых ідэй, якія, між тым, утрымлівалі ў сабе каштоўны педагагічны матэрыял. Усе навучальна-выхаваўчыя інавацыі ператвараліся ў чарговую няўдалую спробу рэфармавання школьнай справы, якая пасля шумнага пачатку паціху пераходзіла ў нябыт, а на змену ёй спакваля прыходзіла наступная.

Вось чаму вельмі хацелася, каб навучаная папярэднім вопытам сучасная школа набыла здольнасць адасабляць грунтоўныя, апрабаваныя навукай і практыкай педагагічныя падыходы ад лёгкадумных, хоць знешне і прывабных ідэй. У рэшце рэшт мы павінны зразумець, што практычна кожная педагагічная парадыгма мае як станоўчыя, так і негатыўныя бакі і ў асноўным усё залежыць ад умення бачыць тое і другое, ад правільнага іх выкарыстання з улікам шматлікіх фактараў, што ўплываюць на канчатковы вынік.

Вельмі непажадана, каб сучасны напрамак выкарыстання народна-педагагічных ідэй у нацыянальнай школе ператварыўся ў чарговую даніну модзе. Да таго ж грунтоўнае вывучэнне і выкарыстанне народнага выхаваўчага вопыту даўно дапамагло б нам пазбавіцца ад ілюзіі ўсемагутнасці выхавання. У народзе прыкмецілі, што прыроджаныя асаблівасці індывіда, яго акружэнне часам бываюць

больш уплывовымі на фарміраванне чалавека, чым шматлікія намаганні выхавальнікаў. Значыць, і само выхаванне магчыма толькі ў пэўных межах.

Трэба адзначыць, што сёння ўвачавідкі набірае моц напрамак вывучэння педагагічнай спадчыны беларускага народа і практычнага яе выкарыстання ў справе выхавання падрастаючых пакаленняў. І калі даследаванні здабыткаў айчыннай педагагічнай думкі хоць і далёка яшчэ не дасягнулі кульмінацыйнага ўзроўню, але ўсё ж набылі досыць акрэсленыя абрысы, то напрамкі непасрэднага ўжывання ў педагагічным працэсе выхаваўчых ідэй продкаў знаходзяцца на пачатковым этапе тэарэтычнага асэнсавання. Не дзіўна, што іх практычнае выкарыстанне часта носіць хаатычны, эпізадычны і павярхоўны характар.

Часцей за ўсё з адладжанай народна-выхаваўчай практыкі (так да канца і не асэнсаванай сучаснымі педагогамі) штучна вырываюцца асобныя элементы, у лепшым выпадку — іх сукупнасць, і робіцца спроба шляхам уключэння апошніх у сучасны адукацыйна-выхаваўчы працэс істотна яго палепшыць. Думаецца, што такія падыходы наўрад ці могуць даць па-сапраўднаму добры плён.

Калі глядзець у корань, то досыць катэгарычна можна сцвярджаць, што асноўным напрамкам выкарыстання ідэй этнапедагогікі нашага народа павінна быць у першую чаргу распрацоўка такой педагагічнай тэорыі, якая б зыходзіла з дасягненняў сучаснай навукі, але абавязкова абапіралася б на нацыянальны вопыт і ўласныя набыткі. Менавіта глыбокае асэнсаванне і шырокае выкарыстанне народна-выхаваўчага гістарычнага вопыту дазволіць стварыць педагагічныя канцэпцыі, якія будуць улічваць рэаліі сучаснасці і арыентаваны на перспектывы будучыні. Прычым яны ні ў якім разе не могуць быць адзінымі для розных этнасаў.

Адна з прычын выхаваўчых няўдач сучаснай школы бачыцца менавіта ў тым, што ўвесь папярэдні час рабілася спроба будаваць яе работу на нейкім універсальным, практычна аднолькавым для ўсіх рэгіёнаў былога СССР навукова-педагагічным падмурку. Так, пры абгрунтаванні прынцыпаў выхавання кожны падручнік педагогікі засяроджваў увагу на ўліку індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей выхаванцаў і практычна нічога не гаварылася аб уліку іх этнічных і рэгіянальных асаблівасцей. У агульнатэарэтычных палажэннях даволі часта паўтараўся тэзіс аб тым, што чужыя дасягненні не могуць аўтаматычна прыжыцца на айчыннай глебе, а ў рэальным жыцці часта рабілася наадварот.

Разважаючы аб напрамках выкарыстання ідэй народнай педагогікі ў сучаснасці, трэба таксама мець на ўвазе, што так ці інакш, але ідэі навуковай педагогікі ў рэшце рэшт вынікаюць з выхаваўчых поглядаў і выхаваўчага вопыту



народа. Вось чаму народна-педагагічныя ідэі (хоць і не абавязкова непасрэдна) не могуць не ўваходзіць у сучасную педагагічную навуку і практыку. Таму не заўсёды трэба шукаць прамой экстрапаляцыі іх у сённяшняй дзейнасці школы.

Думаецца, што такія адносіны да выхаваўчай спадчыны Бацькаўшчыны дадуць несумненна больш, чым фрагментарнае, вузка прагматычнае выкарыстанне асобных яе напрацовак і падыходаў, што, на жаль, і робіцца ў самы апошні час. У святле вышэйсказанага хацелася б спыніцца на асобных характарыстычных асаблівасцях педагагічнай думкі беларускага народа, улік якіх павінен узбагаціць канцэптуальныя падыходы да вырашэння выхаваўчых праблем сучаснасці і дапамагчы распрацаваць педагагічныя парадыгмы, зарыентаваныя на будучыню.

Беларуская нацыя (як, бадай, ніякая іншая) прайшла вельмі складаны шлях свайго станаўлення, якому ўласцівы шэраг выразных адметнасцей і ўласцівасцей, што значна паўплывалі на педагагічную культуру нашага народа. Калі звярнуцца да вытокаў этнапедагагічных ідэй нашых прашчураў, то можна даволі лёгка прыйсці да высновы, што ў якасці галоўнай выхаваўчай мэты на беларускіх землях — як, дарэчы, і на землях іншых усходніх славян — заўсёды вылучалася неабходнасць фарміравання дабрачыннай, цнатлівай асобы.

Магутны пласт педагагічных ідэй сфарміраваўся на аснове народнага фальклору. Мудрасць народа, яго светапогляд, маральна-этычныя ідэалы, жыццёвы вопыт, адносіны да дабра і зла выразна праяўляліся ў вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, якая яўны прыярытэт аддавала этычнай праблематыцы. У згодзе з хрысціянскімі трактатамі сама чалавечая дасканаласць (як важнейшая выхаваўчая мэта) разумелася перш за ўсё як маральна-духоўная дасканаласць, і на яе фарміраванне павінна было накіроўвацца выключна ўсё ў зямны перыяд жыцця.

Асноватворныя пастулаты педагогікі беларусаў пераконвалі, што «добрая цнота даражэйшая за срэбра і злота». У народзе існавала перакананне, што скіраванасць да высокай духоўнасці з'яўляецца вызначальнай умовай у развіцці чалавечай асобы. Не выпадкова, што на беларускіх землях шырокае распаўсюджанне знайшлі ідэі пратэстанцыяністаў, якія, у прыватнасці, лічылі, што Ісус Хрыстос з'яўляўся зямным чалавекам, але дасягнуў боскай сутнасці дзякуючы свайму высокамаральнаму, дабрачыннаму жыццю.

З развіццём пісьменнасці народна-выхаваўчыя погляды пераносяцца на старонкі мастацкай літаратуры, выданняў педагагічнага напрамку і багаслоўскіх кніг. На думку акадэміка Дз. С. Ліхачова, уся тагачасная літаратура, якая распаўсюджвалася на тэрыторыі беларускага, рускага і ўкраінскага народаў, насіла «вучыцельны характар». Пры-

чым выхаванне і тут разглядалася ў першую чаргу пад этычным вуглом бачання. Вядомы айчынны асветнік Кірыла Тураўскі сцвярджаў, што нічога не можа быць для чалавека вышэй, чым духоўная прыгажосць.

К сярэднім вякам маральна-выхаваўчыя накірункі ў айчыннай педагагічнай думцы адцянілі на другі план пытанні навучання і яго методыкі. Так, нават сугуба дыдактычная з сённяшняга пункту гледжання тэрміналогія ў той перыяд мела значны этыка-педагагічны сэнс. Напрыклад, адзін з самых распаўсюджаных дзеясловаў «учити» азначаў не толькі вучыць, але і павучаць, накіроўваць.

Такі невялічкі экскурс у гісторыю педагагічнай думкі нашага народа лішні раз пацвярджае правільнасць выбраных напрамкаў распрацаванай у Рэспубліцы Беларусь стратэгіі рэфармавання выхавання, якая вызначае прыярытэты, што абапіраюцца на нацыянальную педагагічную культуру. Маральна-выхаваўчаму аспекту ў гэтым рэфармаванні проста не можа не надавацца першарадная ўвага. Да гэтага падштурхоўваюць надзённыя патрэбы грамадства, шматвяковы выхаваўчы вопыт народа.

Не менш выразнай асаблівасцю педагагічнай думкі беларускага народа была ўзаемасувязь імкнення да высокай духоўнасці з імкненнем да ўдасканалення розуму, узбагачэння яго ведамі. У народна-педагагічных поглядах на працягу гісторыі ўсталёўвалася думка, што адукаванасць — падмурак выхавання асобы. Нездарма інтэлектуальныя якасці нашымі продкамі часта атаясамліваліся з маральнымі дабрачыннасцямі. Меркавалася, што мудрасць, як правіла, рэалізуецца ў дабрадзейнае жыццё. Адзін з пастулатаў народнай педагогікі катэгарычна заключаў: «Навука даражэй за ўсякае багацце».

Усё гэта зусім адпавядала тагачаснай рэчаіснасці. У гады росквіту беларускай дзяржаўнасці, якія супадаюць з эпохай Адраджэння, на землях Бацькаўшчыны ўзровень развіцця культуры, адукацыі, яскравага іх паказчыка — кнігадрукавання — набліжаўся да еўрапейскага. У сувязі з гэтым мусім заўважыць, што сучаснае становішча ў нашым грамадстве, калі значна зніжаны прэстыж ведаў і адукаванасці, не толькі негатыўнае для далейшага развіцця краіны, але і ненатуральнае для менталітэту беларускага народа. Таму з упэўненасцю можна гаварыць, што такі стан спраў (дарэчы, які мала залежыць ад педагогаў) з'яўляецца часовым. Наданне выключнай увагі развіццю і ўдасканаленню асветы павінна на справе, а не на словах стаць надзённай задачай дзяржавы.

Сённяшнія распрацоўшчыкі тэарэтычных асноў выхавання і арганізатары-практыкі гэтага працэсу павінны таксама ўлічваць тое, што айчынная педагагічная думка ва ўсе часы характарызавалася скіраванасцю на абшчыннасць, супольнасць, таварыскасць. Фальклорна-педагагічная скарбонка нашага народа ўтрымлівае шэраг выслоўяў, якія падкрэсліваюць перавагу грамадскага ладу жыцця: «Моцны статак чарадою, а людзі грамадою», «Адзін дуб у полі — то не лес», «Калі робіш укупе, не баліць у пупе», «У гурце нічога не страшна» і інш.

Скіраванасць на агульнае дабро, служэнне «пожитку посполитому» — характарыстычная асаблівасць айчыннай грамадска-педагагічнай думкі. Даволі ярка выказаў такія падыходы Ф. Скарына, які пісаў: «Не толико бо сами собе народихомся на свет, но более ко службе божией и посполитого доброго». Таму «каждый хрестианин, свое имея дарование и посполитого доброго розмножению да уделяеть». Нават эпоха Рэнесансу, якая ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе ідэі індывідуалізму ўзняла на небывалую вышыню, на беларускіх землях толькі зарыентавала на магчымасць дасягнення ўласнага шчасця, але абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра.

Крытэрыем дабрадзейнасці асобы ў нашага народа заўсёды лічылася карыснасць яе паводзін для грамадства. Вось чаму і сёння шэраг індывідуалістычных падыходаў, якія падчас бяздумна капіруюцца з замежнага ладу жыцця, выклікаюць вельмі негатыўную рэакцыю людзей. Дарэчы, на гэтую акалічнасць павінны звярнуць увагу дзяржаўныя і палітычныя дзеячы пры выбары напрамкаў развіцця нашай дзяржавы ўвогуле.

Не менш выразнай і характэрнай асаблівасцю маральна-выхаваўчых ідэй народнай педагогікі, карані якіх бяруць пачатак у глыбокай старажытнасці, з'яўляецца напрамак прывіцця любві да Радзімы, да яе народа. Колькі песень, калыханак, прыказак і прымавак услаўляюць прыгажосць і непаўторнасць роднага краю, падкрэсліваюць мудрасць і веліч простых людзей, апяваюць народных герояў. Патрыятычныя памкненні прысутнічаюць у поглядах любога народа, але, мабыць, толькі ва ўсходніх славян яны набываюць такую ўстойлівасць і глыбіню, па якіх вымяраецца ўвесь сэнс чалавечага жыцця.

Варта ўвагі тое, што ва ўяўленні нашага народа патрыятызм павінен быць прасякнуты пачуццямі любві, спагады, адданасці, самаахвяравання і ў значна меншай ступені — помслівасцю, ваяўнічасцю, фанабэрыстасцю, пыхлівасцю. Праяўляцца патрыятычныя пачуцці павінны не толькі на ратным полі, але і ў мірны час.

Асабліва важную ролю павінны адыгрываць педагагічныя набыткі нашых продкаў у вызначэнні зместу выхавання. Відавочна, што і сёння працэс фарміравання рыс і якасцей, якія найбольш уласцівы беларускаму народу, будзе праходзіць больш эфектыўна і вынікова, чым іншых. Вось чаму дакладнае, аб'ектыўнае вызначэнне тыповых рыс і якасцей беларускага народа нясе на сабе не толькі пазнавальную, але і актуальна-прагматычную значнасць.

Даследчыкі аднадушны ў тым, што для нашага народа характарыстычна-вызначальнымі якасцямі з'яўляюцца добразычлівасць, шчырасць, міласэрнасць, спагадлівасць, схільнасць да спачування, незласлівасць, міралюбнасць, памяркоўнасць, цярплівасць, паслухмянасць, беражлівасць і інш. Звычайна з дапамогай гэтых і ім падобных рыс і якасцей і маляваўся сацыяльна-псіхалагічны партрэт беларуса. Але ж мусім заўважыць, што ў простанародным асяроддзі яшчэ ў XVII ст. была прымаўка: «На схіленае дрэва і козы залазяць». Да таго ж нашы продкі заўсёды праяўлялі сур'ёзны клопат аб выхаванні храбрасці, адвагі, рашучасці. У народзе былі ўпэўнены, што «адвагаю і пекла пяройдзеш», бо «смеламу бог памагае».

Сёння мы павінны звярнуць пільную ўвагу і на тое, якое прыярытэтнае месца адводзілі нашы прашчуры выхаванню такіх якасцей, як павага да старэйшых, шанаванне сваіх бацькоў. У сучасны момант гэтая праблема абвастрылася, мабыць, як ніякая іншая. Прычын гэтаму многа, але ёсць адна, на якую практычна ніхто не звяртае ўвагі, хоць яна досыць уплывова ўздзейнічае на сучасную рэчаіснасць. Справа ў тым, што ў многіх народаў павага да старых настолькі фетышызавана, выяўлена ў такіх катэгарычных формах, што дазваляе апошнім займаць самае высокае іерархічнае становішча ў сацыяльна-бытавым уладкаванні грамадства, практычна незалежна ад асабістых якасцей.

У нашага ж народа, пры ўсёй пашане і павазе да старэйшых, свой аўтарытэт і пачцівыя адносіны да сябе яны яшчэ пэўным чынам павінны заслужыць у грамадстве, бо, як сцвярджалася ў сентэнцыях XVI ст., «не ўсіх старых карысна слухаць, толькі прыкметных розумам і вагой разважанняў шануй». У народзе лічаць, што бывае, калі «волас сівее, то розум дурэе».

Вось чаму ў адрозненне ад некаторых іншых народаў мы павінны прыкладаць значна большыя намаганні ў вырашэнні гэтага пытання, каб атрымаць станоўчы вынік. З гэтага пункту гледжання відавочна і тая шкода, якая наносіцца выхаваўчай практыцы ў сучаснасці, калі памылкі дзяржаўнай палітыкі папярэдніх гадоў аўтаматычна пераносяцца ў грамадскай думцы ўвогуле на старэйшыя пакаленні, што яшчэ больш ускладняе праблему. У сваю чаргу гэта яшчэ раз падкрэслівае неабходнасць шырокамаштабнай педагагізацыі ўсіх фактараў сацыяльнага жыцця.

Праз прызму ўсебаковага вывучэння этнапедагагічнай спадчыны сёння патрэбна больш поўна асэнсаваць асноватворныя прынцыпы і заканамернасці выхавання ў сучаснай школе. Так, напрыклад, гістарычны рух за ўраўніванне ў грамадзянскіх правах жанчыны і мужчыны прывёў да гіпертрафіраванага разумення такой роўнасці ў розных сферах жыцця, у тым ліку і ў выхаванні. Гістарычны вопыт сведчыць, што выхаванне хлапчукоў, якое ажыццяўлялі нашыя продкі, вельмі адрознівалася ад выхавання дзяўчынак, асабліва з ростам дзяцей. У наш жа час усе грамадска-выхаваўчыя інстытуты (дзіцячы садок, школа, ВНУ і інш.) будуюць сваю работу практычна без уліку розніцы па полу дзяцей. Нездарма жартуюць, што мы зараз выхоўваем мужчынападобных жанчын і жаноцкіх мужчын. З гэтай нагоды можна толькі вітаць і ўсямерна падтрымліваць сучасныя захады па стварэнню спецыяльных курсаў, гурткоў, аб'яднанняў, цэлых школ, дзе адукацыйна-выхаваўчы працэс падпарадкаваны мэце фарміравання сапраўдных мужчын і жанчын.

Бадай, адным з самых шырокіх напрамкаў дзейнасці ў выкарыстанні сёння этнапедагагічных ідэй з'яўляецца ўдасканаленне з іх дапамогай метадаў і сродкаў выхавання. Хоць гэта гучыць некалькі і парадаксальна, але, думаецца, што адным з найбольш слабых бакоў навуковай педагогікі з'яўляецца залішняя катэгарычнасць адносна ацэнкі магчымых шляхоў арганізацыі выхавання. Прычым такая катэгарычнасць з цягам часу, накшталт маятніка, магла палярна мяняць свае ацэнкі, але ўсё роўна заставацца катэгарычнасцю. У гісторыі навукі адны і тыя ж выхаваўчыя падыходы то прыўзносіліся, то лічыліся малаэфектыўнымі. Рабіліся спробы жорсткай рэгламентацыі выкарыстання таго ці іншага выхаваўчага метаду ці сродку. Такі лёс напаткаў вербальныя метады, метады практыкаванняў і інш.

Падыходы ж народнай педагогікі ў гэтым плане адзначаюцца большай гнуткасцю, шматварыятыўнасцю. Тут мірна ўжываюцца здавалася б такія процілеглыя пастулаты, як: «Ласкыю скорей дапросисься, дошлесься и старыва и малыва», «Хто на дзяцей вяроўку шкадуе, той на сябе вяроўку гатуе». У народзе вельмі тонка разумелі магчымасці прымянення тых ці іншых метадаў або сродкаў выхавання. Было прыкмечана, што адзін і той жа сродак у залежнасці ад розных умоў можа даць зусім супрацьлеглыя вынікі. Слынны айчынны педагог XVII ст. Сімяон Полацкі пісаў: «Коса о камень может ся тупити, но мечь камнем может ся острити».

Сённяшняя навука і практыка толькі б выйгралі, калі б мы не адмаўляліся ад вывучэння нават такіх, некалі надзвычай распаўсюджаных метадаў, як метады пакарання, патрабавання забарон, выкарыстання страху, прымусу і інш., грунтоўна і ўсебакова іх даследавалі. Узважаны, крытычны аналіз дапаможа замест механічнага накладання агульнага табу на іх выкарыстанне знайсці там пэўныя элементы, падыходы, якія дапамогуць узбагаціць арсенал сучасных выхаваўчых метадаў і сродкаў. Для многіх такія прапановы могуць падацца дзікунствам, але ўсё залежыць ад таго, як іх разумець, які сэнс укладваць у гэтыя тэрміны, якім чынам і ў якой ступені іх выкарыстоўваць. Соль, перац у чыстым выглядзе таксама неядомыя прадукты, а ці

можам мы ўявіць без іх наша харчаванне? У рэлігійным выхаванні не толькі існуюць побач, але і істотна дапаўняюць адзін аднаго любоў да Бога і страх перад ім. Але страх не ў звычайным разуменні гэтага слова, а хутчэй страх за амаральнасць сваіх паводзін і ўчынкаў.

У апошні час увага грамадскасці засяроджваецца на тым, што пры пашырэнні прадастаўлення свабоды дзецям карысна амаль не выкарыстоўваць забароны ў выхаваўчым працэсе. Часта спасылаюцца на прыклады з выхаваўчай сістэмы ў Японіі, калі дзеці, упаўшы, укалоўшыся, атрымаўшы апёк і г. д., з дапамогай уласнага вопыту самі трывала ўсведамляюць, што можна рабіць, а што нельга.

Дарэчы, у еўрапейскай і айчыннай педагогіцы такі метад раней быў шырока вядомы як «метад натуральных наступстваў», і на яго выкарыстанні засяроджваў увагу яшчэ Я. А. Каменскі. Але гаворка зараз не аб гэтым. Уся справа ў тым, што калі ўдумацца глыбей, то можна прыйсці да высновы, што пры такім падыходзе (парэзаўшы, напрыклад, сабе палец) выхаванец атрымаў пакаранне, прычым фізічнае, за няправільнае выкарыстанне прадмета. А ўжо ў далейшым уласная свядомасць будзе забараняць дзіцяці рабіць гэта з-за страху перад магчымым новым «пакараннем».

Прывяду прыклад з уласнага жыцця. Памятаю, у дзяцінстве дома і ў школе вучылі любіць і шанаваць прыроду, жывёл і птушак. Стараліся адвучыць ад распаўсюджанай у нашай мясцовасці з'явы — збіраць markdown рознакаляровыя птушыныя яйкі для вырабу з іх пацерак. Але, нягледзячы ні на што, многія з дзяцей пераступалі мяжу растлумачэнняў, угавораў і забарон. Аднак ніхто ў наваколлі нават і падумаць не мог, каб запусціць руку ў гняздо ластаўкі, бо існавала павер'е, што той, хто да яго дакранецца, на ўсё жыццё застанецца рабым.

Не думаю, што хтосьці паспрабуе западозрыць аўтара ў жаданні прамой экстрапаляцыі падобных падыходаў у сучаснасць. Вельмі не хацелася, каб такія разважанні нехта ўспрыняў як адыход ад ідэй гуманістычнай педагогікі. Бясспрэчна, што працэс выхавання абавязаны цалкам і поўнасцю быць прасякнуты прынцыпамі гуманізму, выхаванне павінна будавацца пры апоры на станоўчыя якасці асобы, дапамагаць выхаванцам дабівацца радасці поспехаў. У той жа час у сучаснай сітуацыі пра патрабавальнасць, кантроль, дысцыпліну мы нават напаўголаса гаварыць баімся. Такія вось рэаліі нашай рэчаіснасці.

Больш таго, жадаем мы таго ці не, але сёння ў нашай школе ў той ці іншай ступені існуюць і прымус да пэўных дзеянняў, і страх перад пакараннем, і страх перад дрэннай адзнакай, і інш. А ў жыцці з падобным нашы гадаванцы сустракаюцца яшчэ часцей. Чаму ж мы адмахваемся ад гэтай праблемы ці проста дэкларуем, што яе неабходна зжыць? Мабыць, куды больш карысці было б, каб гэта пытанне, дапасавальна да сучасных умоў, было глыбока і грунтоўна даследавана і былі б выпрацаваны адпаведныя рэкамендацыі. І тады страх павінны замяніць дакоры ўласнага сумлення, на месца патрабавальнасці і кантролю прыйдуць самапатрабавальнасць і самакантроль.

Выхаваўчы народны вопыт паказвае, што вельмі часта імператыўная патрабавальнасць да ўчынкаў выхаванцаў, нават і не ўсвядомленая імі на пачатковым этапе, пры мнагакратным практычным прымяненні выпрацоўвала пэўную лінію дзеянняў індывіда, якая ўжо потым замацоўвалася ў свядомасці і выступала ў якасці ўнутранай патрэбнасці паводзіць сябе належным чынам. Таму ўяўляецца, што вышэйшым дасягненнем сучаснай педагогікі ў напрамку выкарыстання этнапедагагічных ідэй сваіх прашчураў з'яўляецца ўменне перавесці страх у любоў, экстравертную прымусовасць — у інтравертную патрэбнасць, што з поспехам ажыццяўляў педагагічны геній нашага народа.

Мы ж і тут спрабуем разарваць цэласны, адзіны працэс і знайсці станоўчыя і негатыўныя бакі выхаваўчай дзейнасці продкаў, падганяючы мінулыя рэаліі пад сучаснасць. Як тут не ўспомніць словы слыннага айчыннага асветніка XVII ст. Саламона Фёдаравіча Рысінскага, які сцвярджаў, што «народ — майстар рабіць памылкі, але агульная думка і вопыт правільныя». Неаднаразова ўказваў на гэта і нацыянальны паэт XVI ст. Мікола Гусоўскі. «Не, не знойдзеце заган у звычаях даўніх»,— пісаў ён.

Дарэчы, узважлівасць, памяркоўнасць нашага народа заўсёды перасцерагалі ад крайнасцей у любым відзе дзейнасці. Так, напрыклад, «празмерная любоў» да дзяцей, як назваў яе Сімяон Полацкі, можа прывесці да вядомага з гісторыі педагогікі педацэнтрызму, а яе недахоп — да аўтарытарызму. З іншага боку, у народзе лічылі, што лепш любячы караць, чым ненавідзячы ўзнагароджваць. З гэтай нагоды С. Рысінскі пісаў: «Больш прыкра заслужыць халодную пахвалу, чым злосную ганьбу...».

Сёння мы ўжо неяк звыкліся з тым, што навукоўцы, даследчыкі вывучаюць, сістэматызуюць, абагульняюць толькі станоўчы вопыт, што само па сабе нейкім чынам лакіруе рэчаіснасць, нівеліруе крытычнасць мыслення, выпрацоўвае стэрэатыпнасць падыходаў. Усебаковы ж аналіз усяго, з сучаснага пункту гледжання, негатыўнага, пралікаў і няўдач у выхаванні не проста ўзбагаціць скарбонку педагагічнай тэорыі і практыкі, а дапаможа ўзняць навучальна-выхаваўчы працэс на якасна новы ўзровень.

Яшчэ адным аспектам выкарыстання ідэй этнапедагогікі нашага народа з'яўляецца пераасэнсаванне і змяненне акцэнтаў у тых выхаваўчых метадах, якія шырока выкарыстоўваюцца і ў традыцыйна бытавых умовах, і пры спецыяльнай арганізацыі выхаваўчага працэсу. Так, ва ўсе часы агульнапрызнана эфектыўным лічыўся ў выхаванні

метад прыкладу. Асноўныя формулы народнай педагогікі засяроджвалі ўвагу на тым, што выхавацель заўсёды сам павінен быць ва ўсім узорам для сваіх вучняў. Сымон Будны адкрыта ў свой час абураўся, што Кальвін «сам не быў пазбаўлены таго, што ганьбаваў у іншых».

Апошнім жа часам пакрысе, у скрытай форме ў грамадска-педагагічную свядомасць пачала ўкрапляцца ідэя аб тым, што можна самому нешта не ўмець рабіць, а іншых навучыць гэтаму. У падмацоўку такіх поглядаў, напрыклад, прыводзяць выпадак, калі трэнер чэмпіёна краіны па плаванню сам не ўмеў плаваць. Практычна робіцца спроба апраўдаць нажніцы, якія існуюць у арганізацыі сучаснага выхаваўчага працэсу, калі выхаванцы ўласнымі вачамі бачаць, як словы іх настаўнікаў разыходзяцца са справамі.

Адказ на гэта зноў-такі можна адшукаць у патаемніках народнай мудрасці, дзе тлумачыцца, што метад прыкладу дае добры плён пры ўзбраенні навучэнцаў пэўнымі ўменнямі і навыкамі, хоць і без яго гэта магчыма. А вось у выхаванні маральна-духоўных якасцей гэтага дабіцца практычна нельга. С. Полацкі катэгарычна заключаў, што калі мы заклікаем нешта рабіць, а самі ў гэтым не з'яўляемся прыкладам, то карысці ад такога выхавання будзе вельмі мала. У прыватнасці ён пісаў: «...от детства благим деле сем учите и сами благо перед ними творите». Ці не тут пашукаць адну з крыніц неэфектыўнасці многіх нашых выхаваўчых сістэм? І менавіта ў гэтым бачыцца адзін з моцных бакоў выхавання сёння ў рознага роду малых групах, рэлігійных сектах і інш.

Наогул, калі весці размову аб выніковай эфектыўнасці народнага выхавання, то, мабыць, галоўнай умовай яе было тое, што выхаванне не вычлянялася з жыцця, яно арганічна ўпляталася ва ўсе сферы чалавечай дзейнасці. Дзеці не адчувалі на сабе ўздзеяння нейкага штучна ствараемага працэсу. Вопыт папярэдніх пакаленняў перадаваўся натуральна, і жаданне ім авалодаць было абумоўлена жыццёвымі патрэбамі. Вось чаму і сёння просты набор, няхай і значнай колькасці выхаваўчых мерапрыемстваў, паказаў сваю вельмі нізкую эфектыўнасць, а падобны напрамак выхаваўчага працэсу — сваю бесперспектыўнасць.

Зыходзячы з народнага вопыту, шырокага ўкаранення ў выхаваўчую практыку патрабуе выкарыстанне старэйшых дзяцей у якасці выхавальнікаў малодшых. У народнай педагогіцы такі падыход меў даволі значнае месца. Дзеці як бы самаразвіваліся. Нагадаем, што і ў перыяд савецкай школы піянеры з ахвотай ішлі важатымі ў акцябрацкія зорачкі, і там іх з прыхільнасцю сустракалі. Думаецца, што і сёння вяртанне да старых ідэй на новым узроўні павінна даць добры плён.

Асобнай тэмы патрабуе размова аб ролі традыцый, звычаяў, абрадаў і рытуалаў у выхаванні і іх сучасным выкарыстанні. Зараз відавочны той урон, які нанесены грамадству штучным выкараненнем іх з сацыяльнага жыцця. Стварыліся значныя прагалы ў адладжанай сістэме, якія запоўніліся ў большай ступені не тым, чым было б пажадана. У той жа час цяпер вельмі ўдумліва трэба падыходзіць і да аднаўлення многіх з абрадаў і звычаяў. Само жыццё павінна падказаць напрамкі ў гэтым працэсе.

У якасці прыкладу спынімся на святкаванні каляд і арганізацыі «шчадравання». Што і казаць, час паказаў іх жывучасць. Лепшае, да чаго дадумалася сучасная школа,— не забараняць дзецям калядаваць. І некалі адно з цудоўнейшых народных свят ператварылася сёння ў хаджэнне па дамах «папрашаек». А як бы змяніўся яго выхаваўчы патэнцыял, калі б дзеці загадзя арганізавалі невялікія тэатралізаваныя групы і ў перыяд свята ў багатай мастацкай форме зычылі б шчасця гаспадарам, вучыліся б правілам людскіх узаемаадносін, веданне этыкету дэманстравалі б на практыцы. Аналагічныя падыходы можна з поспехам прымяняць і ў выкарыстанні з выхаваўчымі мэтамі іншых народных свят, традыцый, абрадаў.

Мабыць, зараз, як ніколі раней, наспеў час, каб агульнымі намаганнямі тэарэтычных даследчыкаў і педагогаў-практыкаў сур'ёзна і грунтоўна асэнсаваць багацейшы выхаваўчы вопыт нашага народа і ўзбагаціць адпаведныя падыходы ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач сучаснасці.